# Хроніка мастацкіх падзей

21 студзеня на мастацка-графічным факультэце адбылося адкрыццё выставы мастака, выпускніка нашага ўніверсітэта, Міхаіла Прагліна "Ізраіль – Беларусь: З любоўю да Віцебска". У экспазіцыі прадстаўлены 53 фотаработы невялікага фармату. З 1992 года Міхаіл пражывае ў Ізраілі, але заўсёды з вялікай радасцю прыязджае ў Віцебск, каб наведаць сваю alma mater. Мастак працуе ў тэхніках графікі, жывапісу, фатаграфіі. Яго работы захоўваюцца ў прыватных зборах Рэспублікі Беларусь, Ізраіля, Германіі, Аўстрыі, Амерыкі.

* * *

Загадчык кафедры выяўленчага мастацтва А.А. Сакалова і дацэнт гэтай жа кафедры М.Л. Цыбульскі з 28 студзеня па 3 лютага прымалі ўдзел у рабоце журы 15-га Міжнароднага конкурсу жывапісу і графікі "На сваёй зямлі" ў якасці члена і старшыні журы. Сярод членаў журы былі прадстаўнікі Балгарыі, Кітая, Літвы, Польшчы, Румыніі, Расіі, Украіны і Беларусі. На конкурс было даслана больш за дзесяць тысяч работ юных мастакоў з 26 краін свету. Выстава па выніках конкурснага адбору адбудзецца ў Мінску ў красавіку гэтага года. Асноўныя вынікі конкурсу і цэлы шэраг пытанняў мастацкай адукацыі абмеркавалі на 11-й Міжнароднай канферэнцыі мастацкага праекта "На сваёй зямлі", у рабоце якой прынялі ўдзел і нашы калегі з мастацка-графічнага факультэта.

* * *

7 лютага адбылася штогадовая цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў прэміі "Чалавек года Віцебшчыны" за 2019 год. Сярод узнагароджаных у намінацыі "Сацыяльная сфера (сацыяльная абарона насельніцтва, культура, адукацыя, навука, спорт, ахова здароўя, моладзь)" – прафесар кафедры гісторыі і сусветнай культуры гістарычнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, доктар мастацтвазнаўства Таццяна Катовіч.

* * *

12 лютага ў Аршанскай гарадской галерэі В.А. Грамыка прадставіў свае жывапісныя творы Освальд Звейсалніекс (Латвія, Рэзэкнэ) на выставе пад назвай "Terra vitae" (куратар М. Цыбульскі). Освальд Звейсалніекс з'яўляецца кавалерам ордэна Трох Зорак, Ганаровым грамадзянінам Рэзэкнэ, прафесарам Латвійскай акадэміі мастацтваў, дырэктарам Рэзэкненскай сярэдняй школы мастацтваў і дызайну. У экспазіцыі ў асноўным прадстаўлены краявіды Латгаліі. У студзені гэтага года выстаўка О. Звейсалніекса адбылася ў Полацку.

* * *

14 лютага ў экспазіцыйнай прасторы УА "Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт" адбылося адкрыццё выставы "Традыцыі і наватарства" (куратар А. Кастагрыз), якая складалася з графічных работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава, што выконваліся на кафедры выяўленчага мастацтва ў розныя гады.

* * *

28 лютага ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі В.А. Грамыка прэзентаваўся чарговы мастацкі праект "Калегіум". У ім прынялі ўдзел выкладчыкі кафедры выяўленчага мастацтва і кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі: прафесар В. Шамшур, дацэнты А. Кастагрыз, С. Сотнікаў, М. Цыбульскі. Арт-праект, які дзейнічае на працягу 11 гадоў, ужо назвалі адной з самых значных падзей культурнага жыцця горада Оршы.

* * *

2 сакавіка ў ДУ «Культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна"» адбылося адкрыццё выставы дзіцячай творчасці "Сакавіцкія каты", на якой экспаніраваліся работы навучэнцаў студыі дзіцячай творчасці Арт-акадэміі "Квадрат", што працуе на мастацка-графічным факультэце ВДУ імя П.М. Машэрава па двух кірунках – выяўленчае і дэкаратыўнае мастацтва.

* * *

6 сакавіка ў памяшканні "Музычная гасцёўня" ў Віцебску адбылося адкрыццё выставы "Вясновае натхненне" з фондаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П.М. Машэрава. Прадстаўлены жывапісныя і графічныя творы студэнтаў розных гадоў. Экспазіцыя пабудавана на дыялогу твораў беларускіх і кітайскіх студэнтаў, якія вучацца на факультэце і ў сваёй творчасці ўвасабляюць вобразы Віцебска і яго наваколляў, сучаснае прадметнае асяроддзе.

* * *

17 сакавіка ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі адкрылася выстава вучэбных і творчых работ кафедры выяўленчага мастацтва і кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі з фондаў мастацка-графічнага факультэта (куратар В. Осіпаў).



Репозиторий ВГУ